Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________________ А. А. Корбут
«____» ________________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСНОВЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

2017

Вучэбная праграма створана на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 11-2014 па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент), рэгістрацыйны № Е 23-1-45/14 вуч. 24.02.2014 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*С. В. Зыгмантовіч,* загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Н. У. Клімянкова,* прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Н. Я. Петушка,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*В. А. Касап,* загадчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 23.10.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 21.12.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: С. В. Зыгмантовіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» – вучэбная дысцыпліна па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент). Актуальнасць яе вывучэння абумоўлена фундаментальнай роллю педагагічных, псіхалагічных і сацыялагічных ведаў у фарміраванні прафесійнага светапогляду студэнтаў, неабходнасцю пераемнасці гістарычнага вопыту, назапашанага айчынным і сусветным бібліятэказнаўствам.

Дыялектычная сувязь псіхолага-педагагічных і сацыялагічных падыходаў да арганізацыі і ўдасканалення бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці дазваляе аб’яднаць у межах адной вучэбнай дысцыпліны пытанні бібліятэчнай педагогікі і псіхалогіі чытання, бібліятэчных зносін як дзейснага інструмента псіхолага-педагагічнага ўплыву на чытанне і чытацкія паводзіны карыстальнікаў бібліятэк, псіхалогіі і сацыялогіі чытання як сродку пазнання і прагназавання чытацкай дзейнасці, рэкамендацыйнай бібліяграфіі як галіны рэалізацыі псіхолага-педагагічных падыходаў у прыцягненні карыстальнікаў да сістэматычнага і мэтанакіраванага чытання, бібліятэчнай сацыяномікі як сферы ўвасаблення псіхолага-педагагічных тэхналогій у рабоце з сацыяльна неабароненымі коламі насельніцтва.

Засваенне адукацыйнай праграмы для спецыяльнасці 1-21 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-5. Весці бібліятэчнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў.

ПК-6. Ажыццяўляць традыцыйную і электронную выдачу і дастаўку дакументаў.

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

ПК-8. Устанаўліваць і падтрымліваць трывалыя сувязі з рознымі сацыяльнымі інстытутамі (сям'я, школа, установы культуры, адукацыі, прадпрыемствы і інш.) з мэтай фарміравання спрыяльнага сацыякультурнага асяроддзя; развіваць сацыяльнае партнёрства з мясцовымі ўладамі і грамадскасцю.

ПК-9. Арганізоўваць і праводзіць інфармацыйна-асветніцкія, адукацыйныя, культурна-творчыя, культурна-дасугавыя і рэкрэацыйна-аздараўленчыя мерапрыемствы.

ПК-10. Фарміраваць безбар'ернае бібліятэчнае асяроддзе для абслугоўвання асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

ПК-11. Выкарыстоўваць псіхолага-педагагічныя метады падчас бібліятэчнага абслугоўвання і правядзення разнастайных сацыяльна-культурных мерапрыемстваў.

Пералічаныя кампетэнцыі прадугледжваюць фарміраванне ўменняў выкарыстання атрыманых ведаў у разнастайных галінах бібліятэчнай дзейнасці.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» з'яўляецца аваладанне прыёмамі псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння з карыстальнікамі ва ўмовах сучаснай бібліятэкі, вырашэння псіхалагічных праблем чытання і засваення інфармацыі, пераўтварэння яе ў веды. Улічваючы, што асновай паспяховага задавальнення чытацкіх інтарэсаў і запытаў з'яўляецца іх пастаяннае вывучэнне, аваладанне метадалогіяй і методыкай сацыялагічнага даследавання чытання і чытацкіх паводзін – не менш значная мэта выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны. Засваенне вучэбнай дысцыпліны павінна таксама спрыяць фарміраванню камунікатыўнай культуры будучых бібліятэчна-інфармацыйных спецыялістаў, іх здольнасці працаваць з самымі разнастайнымі, у тым ліку – сацыяльна неабароненымі групамі чытачоў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае кола вырашаемых ёю *задач:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– разгледзець тэарэтычныя асновы, канцэпцыі і прынцыпы бібліятэчнай педагогікі, псіхалогіі і сацыялогіі чынання, рэкамендацыйнай бібліяграфіі, бібліятэчнай сацыяномікі;

– вызначыць асноўныя гістарычныя перыяды развіцця бібліятэчнай педагогікі, псіхалогіі і сацыялогіі чытання, бібліятэчнай сацыяномікі;

– спрыяць фарміраванню высокай псіхолага-педагагічнай і даследчай культуры, культуры чытання і камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых бібліятэкараў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– гісторыю і тэорыю сацыялогіі і псіхалогіі чытання, бібліятэчнай педагогікі, псіхалогіі, рэкамендацыйнай бібліяграфіі і сацыяномікі;

– асаблівасці бібліятэчнага аблугоўвання сацыяльна неабароненых колаў карыстальнікаў;

– сутнасць і спецыфіку бібліятэчных зносін як інструмента педагагічнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом;

*умець:*

– ажыццяўляць кіраўніцтва сацыялагічным і псіхалагічным вывучэннем чытацкіх характарыстык карыстальнікаў бібліятэк;

– укараняць сучасныя формы і метады псіхолага-педагагічнай і інфармацыйнай падтрымкі чытання і яго аптымізацыі;

– ужываць бібліятэрапію і рэкамендацыйную бібліяграфію пры ўзаемадзеянні з карыстальнікамі;

*валодаць*:

– методыкай кіравання сацыялагічнымі, псіхалагічнымі і сацыянамічнымі даследаваннямі ў бібліятэцы;

– спосабамі ўкаранення сучасных псіхолага-педагагічных, бібліяграфічных і бібліятэрапеўтычных прыёмаў узаемадзеяння з карыстальнікамі.

Вучэбная дысцыпліна «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» грунтуецца на ведах, атрыманых студэнтамі падчас вывучэння вучэбных дысцыплін: «Бібліятэказнаўства», «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія», «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк». Яна таксама звязана і з блокам сацыяльна-гуманітарных дысцыплін: «Культуралогія», «Сацыялогія», «Педагогіка», «Псіхалогія», якія з’яўляюцца тэарэтычнай і метадычнай базай для вывучэння заканамернасцей чытан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня і ўспрымання знакавай інфармацыі, засваення навыкаў зносін, а абслугоўванне карыстальнікаў – сферай ужывання і далейшага ўдасканалення гэтых навыкаў у прафесійнай дзейнасці бібліятэкара.

У сваю чаргу веды, уменні, атрыманыя пры вывучэнні псіхалага-педагагічных асноў бібліятэчнай дзейнасці, з'яўляюцца падмуркам для засваення іншых вучэбных дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага цыкла: «Інфармацыйныя рэсурсы», «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг», дысцыплін спецыялізацый, звязаных з падрыхтоўкай бібліятэчных прадуктаў і паслуг і задавальненнем патрэбнасцей карыстальнікаў у інфармацыі.

Псіхалага-педагагічныя падыходы да ўзаемадзеяння з карыстальнікам разглядаюцца ў вучэбнай дысцыпліне як інструмент, сродак рэалізацыі прафесійнага і асобаснага патэнцыялу бібліятэкара.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Псіхалага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» прадугледжана 118 аўдыторных гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў наступнае: 56 гадзін – лекцый, 14 – семінарскіх, 10 – лабараторных і 38 – практычных заняткаў. Рэкамендаваныя формы кантролю: залік у V і VII семестрах і экзамен у IV семестры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Сацыяльная абумоўленасць увядзення вучэбнай дысцыпліны «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці». Задачы вучэбнай дысцыпліны. Роля педагогікі, псіхалогіі, сацыялогіі чытання, рэкамендацыйнай бібліяграфіі і бібліятэчнай сацыяномікі ва ўмовах крызісу чытання. Метадалагічная база вучэбнай дысцыпліны. «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» ў сістэме падрыхтоўкі сучаснага бібліятэкара. Сувязь вучэбнай дысцыпліны з вучэбнымі дысцыплінамі бібліятэчна-бібліяграфічнага, псіхолага-педагагічнага і агульнаадукацыйнага цыклаў. Інфармацыйна-метадычная забяспечанасць вучэбнай дысцыпліны.

## Раздзел 1. Бібліятэчная педагогіка

*Тэма 1. Бібліятэчная педагогіка: гісторыя і сучаснасць*

Эвалюцыя ўяўленняў аб педагагічнай накіраванасці дзейнасці бібліятэк. Зараджэнне і станаўленне бібліятэчнай педагогікі ў межах тэорыі пазашкольнай адукацыі. Педагагічныя тэорыі В. П. Бехцерава, А. У. Зяленкі, В. І. Чарналускага, погляды бібліятэказнаўцаў Б. П. Гушчына, М. А. Рубакіна, М. Ф. Фёдарава, М. А. Корфа, Я. М. Мядынскага. Спецыфіка педагагічнага падыходу да бібліятэчнай дзейнасці ў савецкія часы.

Уклад беларускіх навукоўцаў В. М. Бігезы, Л. А. Дзямешкі, В. А. Дукель, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай, Н. Я. Петушкі ў развіццё бібліятэчнай педагогікі. Расійскія бібліятэказнаўцы А. Я. Айзенберг, Л. В. Белякоў, А. Н. Ванееў, Ю. В. Грыгор'еў, А. С. Чубар'ян, Н. У. Збароўская, Ю. П. Мяленцьева, І. І. Ціхамірава, У. І. Цярошын аб педагагічнай накіраванасці бібліятэчнай дзейнасці. Актуалізацыя педагагічнай праблематыкі на сучасным этапе ў сувязі з трансфармацыяй бібліятэкі і бібліятэчнай прафесіі.

*Тэма 2. Сутнасць, значэнне, задачы,*
*прынцыпы і катэгорыі бібліятэчнай педагогікі*

Бібліятэчная педагогіка як навука. Падыходы да вызначэння паняцця «бібліятэчная педагогіка». Аб'ект і прадмет бібліятэч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най педагогікі. Мэта бібліятэчнай педагогікі. Уяўленні аб задачах бібліятэчнай педагогікі на розных этапах існавання грамадства. Эвалюцыя прынцыпаў бібліятэчнай педагогікі.

Кірункі бібліятэчнай педагогікі: агульнапедагагічны, камунікатыўны, кагнітывісцкі, акмеалагічны і бібліятэрапеўтычны. Тэорыя і практыка кіраўніцтва чытаннем. Педагогіка супрацоўніцтва ва ўмовах бібліятэкі. Рэалізацыя прынцыпаў андрагогікі ў бібліятэчным абслугоўванні карыстальнікаў. Катэгорыі бібліятэчнай педагогікі: кіраўніцтва чытаннем, фарміраванне культуры чытання, чытацкае развіццё асобы, чытацкая свядомасць, чытацкая дзейнасць, чытацкія зносіны, інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе бібліятэкі.

*Тэма 3. Педагагічныя ўмовы*
*ўдасканалення бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Спецыфіка бібліятэкі як педагагічнай сістэмы. Класіфікацыя педагагічных умоў, ад якіх залежыць паспяховасць і эфектыўнасць функцыянавання бібліятэкі. Спецыфіка арганізацыйна-педагагічных, псіхолага-педагагічных і дыдактычных умоў забеспячэння карыстальнікам бібліятэк свабоднага доступу да інфармацыі і ведаў у сучаснай бібліятэцы. Арганізацыйна-педагагічныя ўмовы як аснова кіравання функцыянаваннем і развіццём працэсуальнага аспекту педагагічнай сістэмы. Псіхолага-педагагічныя ўмовы і іх накіраванасць на развіццё асобаснага аспекту педагагічнай сістэмы. Дыдактычныя ўмовы як вынік мэтанакіраванага адбору, канструявання і ўжывання элементаў зместу, метадаў (прыёмаў), а таксама арганізацыйных форм бібліятэчнай дзейнасці. Умовы развіцця асобных элементаў сістэмы «бібліятэка».

## Раздзел 2. Бібліятэчныя зносіны як сродак рэалізацыі педагагічных функцый бібліятэкі

*Тэма 4. Сутнасць, спецыфіка і педагагічная накіраванасць*
*прафесійных зносін бібліятэкара*

Паняцце «бібліятэчныя зносіны». Спецыфіка бібліятэчных зносін у параўнанні з іншымі відамі зносін. Структура зносін, іх перцэптыўны, камунікатыўны і інтэрактыўны аспекты. Праявы кожнага з аспектаў у бібліятэчных зносінах. Камунікатыўная прырода чытання, роля зносін у яго арганізацыі і забес-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пячэнні на розных этапах: у перадкамунікатыўнай, камунікатыўнай і посткамунікатыўнай фазах. Віды і формы бібліятэчных зносін. Непасрэдныя і апасродкаваныя бібліятэчныя зносіны. Фармальна-ролевыя, маніпулятыўныя і гуманістычныя зносіны. Суб'ект-суб'ектныя і суб'ект-аб'ектныя зносіны. Змястоўныя і згорнутыя зносіны. Індывідуальныя, групавыя і масавыя зносіны. Сацыяльна-педагагічныя аспекты бібліятэчных зносін.

### *Тэма 5. Умовы і прыёмы эфектыўнага міжасабовага ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам у працэсе абслугоўвання*

Псіхолага-педагагічныя ўмовы прадуктыўных і выніковых зносін бібліятэкара з карыстальнікам. Роля ўзаемнага ўспрымання партнёраў у бібліятэчных зносінах. Выбіральнасць, глабальнасць і праектыўнасць успрымання. Заканамернасці ўспрымання. Эфекты ўспрымання, іх роля ў зносінах. Атрыбуцыя. Законы атрыбуцыі і іх праявы ў бібліятэчных зносінах. Роля і месца міжасабовай атракцыі ў бібліятэчных зносінах. Фактары, якія вызначаюць міжасабовую атракцыю, іх спецыфіка ва ўмовах бібліятэчных зносін.

Самапрэзентацыя бібліятэкара ў зносінах з карыстальнікам. Бар'еры ў зносінах бібліятэкара з карыстальнікам і прыёмы іх пераадолення. Характэрныя асаблівасці дыялагічных зносін у бібліятэцы. Самаацэнка і самапавага як крыніцы псіхалагічнай устойлівасці і паспяховасці ў зносінах. Дамінантныя і недамінантныя суразмоўнікі, рыгідныя і мабільныя карыстальнікі, экстраверты і інтраверты: адметныя рысы і прыёмы ўзаемадзеяння з імі. Трансактны аналіз і яго выкарыстанне ў бібліятэчных зносінах. Прыёмы актыўнага слухання. Умовы каардынацыі і сінхранізацыі суразмоўніка ў бібліятэчных зносінах.

### *Тэма 6. Прафілактыка і ліквідацыя канфліктных сітуацый у бібліятэчных зносінах*

Бібліятэчная канфліктаалогія: мэта, задачы, прынцыпы. Тыповыя падставы для канфліктаў ва ўмовах бібліятэчнага абслугоўвання. Адметныя рысы канфліктнай сітуацыі. Псіхалагічная прырода канфліктнасці. Канфліктагены і іх роля ва ўзнікненні канфлікту. Тыпы канфліктагенаў і спосабы рэагавання на іх з мэтай прадухілення канфлікту. Эскалацыя канфлікту і як яе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазбегнуць. Крокі, накіраваныя на аслабленне псіхалагічнага прэсінгу з боку чытача. Правілы паводзін бібліятэкара ў выпадку прад'яўлення чытачом ультыматыўных патрабаванняў. Правілы рацыянальных паводзін у канфлікце з чытачом. Паводзіны, якіх трэба пазбягаць у канфлікце. Тыпы канфліктных асоб і спосабы іх нейтралізацыі. Спосабы выйсця з канфлікту. Цана канфлікту. Ліквідацыя вынікаў канфлікту.

Канфлікты ў бібліятэчным калектыве і іх адмоўны ўплыў на якасць абслугоўвання. Віды вытворчых канфліктаў і асаблівасці іх уплыву на бібліятэчныя зносіны, спосабы прафілактыкі і пераадолення.

### *Тэма 7. Арганізацыя чытацкіх зносін у сучаснай бібліятэцы*

Паняцце «чытацкія зносіны» ў бібліятэказнаўстве. Публічная бібліятэка як цэнтр чытацкіх зносін. Месца чытацкіх зносін у фарміраванні інфармацыйнай культуры асобы. Формы і метады арганізацыі чытацкіх зносін. Франтальнае абслугоўванне як спосаб арганізацыі чытацкіх зносін. Кніжныя фестывалі, «бібліяночы», каворкінгі і флэшмобы, іх роля ў актывізацыі чытацкіх зносін. Прыцягненне СМІ і іншых партнёраў да арганізацыі чытацкіх зносін. Чытацкія зносіны ў электронным асяроддзі: спецыфіка і спосабы выкарыстання ў бібліятэцы.

Індывідуальныя, групавыя і масавыя чытацкія зносіны ў бібліятэцы. Клубы па інтарэсах і чытацкія аб'яднанні як формы арганізацыі чытацкіх зносін. Роля бібліятэкара ў арганізацыі чытацкіх зносін. Алгарытм дзейнасці бібліятэкара падчас арганізацыі чытацкіх зносін.

### *Тэма 8. Чытацкая і камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара як перадумова яго прафесійнай самарэалізацыі*

Змест паняцця «камунікатыўная культура бібліятэкара». Кампетэнтнасць у зносінах і камунікатыўная культура. Роля і месца камунікатыўных якасцей у прафесіяграме бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Аптымальнае спалучэнне асобасных і прафесійных якасцей бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Шляхі і спосабы фарміравання і ўдасканалення камунікатыўнай культуры бібліятэкара. Метады вывучэння бібліятэчных зносін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля вынікаў даследавання зносін у фарміраванні камунікатыўных якасцей бібліятэкара. Псіхалагічная карэкцыя бібліятэчных зносін. Сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі як сродак павышэння камунікатыўнай культуры. Дзелавыя і ролевыя гульні ў карэкцыі бібліятэчных зносін. Бібліятэчная этыка аб камунікатыўнай культуры бібліятэкара. Этычныя правілы прафесійных паводзін і камунікатыўная культура бібліятэкара.

## Раздзел 3. Чытанне як псіхалагічны працэс і прадмет даследавання

### *Тэма 9. Развіццё псіхалогіі і сацыялогіі чытання ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць*

Вывучэнне карыстальніка як аснова абслугоўвання і сусветная прафесійная праблема: этапы станаўлення і развіцця псіхалогіі і сацыялогіі чытання. Сістэмны падыход да псіхалогіі бібліятэчнай справы ў рабоце А. А. Гайвароўскага (1928). Псіхалагічныя аспекты бібліяпедагогікі. Даследаванні псіхалогіі чытання і чытацкіх зносін у другой палове XX ст.

Вывучэнне карыстальнікаў у межах агульнасаюзных даследаванняў. Роля Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна ў развіцці сацыялогіі чытання ў Беларусі. Даследаванні: «Роля кнігі і бібліятэкі ў жыцці сучаснай беларускай вёскі» (1978), «Кніга і чытанне ў жыцці рабочых ударных камсамольскіх будоўляў на Беларусі» (1984).

Правядзенне самастойных сацыялагічных даследаванняў у 1990-я гг.: «Чытач масавых публічных бібліятэк», «Кніга і чытанне ў жыцці нацыянальных меншасцяў», «Роля бібліятэкі ў абслугоўванні маланаселеных пунктаў», «Чытач навуковай бібліятэкі і праблемы ўдасканалення яго абслугоўвання», «Структура і дынаміка дзіцячага чытання на Беларусі».

Маркетынгавы падыход да даследаванняў чытача і чытання. Даследаванне «Публічная бібліятэка ў сацыякультурным асяроддзі рэгіёна» (2001). Маніторынгавы характар даследавання карыстальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Даследаванні: «Інфармацыйныя патрэбнасці насельніцтва аграгарадкоў» (2007), «Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь» (2011), «Інфармацыйныя паводзіны карыстальнікаў бібліятэк Беларусі» (2013). Міжнародныя даследаванні чытання. Беларуска-расійскія даследаванні чытан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня. Вынікі сацыялагічных даследаванняў чытання на старонках прафесійнага друку і ў дысертацыйных даследаваннях.

*Тэма 10. Псіхалагічная структура чытацкай дзейнасці, чытацкай свядомасці і чытацкіх зносін. Чытацкая накіраванасць і чытацкі статус асобы*

Псіхалогія чытання як сістэма ведаў двух навук: псіхалогіі і чытачазнаўства. Прадмет і кола праблем псіхалогіі чытання. Тэорыя чытацкага развіцця асобы як канцэптуальная аснова аналізу псіхалагічных аспектаў чытання. Узроўні, шляхі і этапы чытацкага развіцця асобы. Чытацкая дзейнасць як адзін са спосабаў існавання чалавека. Псіхалагічная сутнасць чытацкай дзейнасці. Сувязь чытацкай дзейнасці з чытацкай свядомасцю, іх узаемаабумоўленасць. Чытацкія зносіны як форма існавання чытацкай свядомасці і чытацкай дзейнасці. Віды, функцыі і фазы чытацкіх зносін. Чытацкая накіраванасць як сістэма адносін. Чытацкая патрэбнасць як стан асобы і крыніца актыўнасці чытача. Матывы чытання. Матывацыя чытання. Падыходы і методыкі вывучэння матывацыі чытання. Чытацкія інтарэсы. Чытацкая ўстаноўка. Пазнанне, эмоцыі і паводзіны як кампаненты чытацкай устаноўкі. Фазы чытання. Чытацкі статус асобы. Прэстыж і аўтарытэт чытача. Чытацкая мода.

*Тэма 11. Праблемы тыпалогіі чытача з пункту гледжання тэорыі чытацкага развіцця. Акмеалагічная канцэпцыя чытання*

Міждысцыплінарны характар тэорыі чытацкага развіцця. Навуковыя падыходы да пабудовы мадэлі чытацкага развіцця. Канцэпцыя С. А. Трубнікава, яго погляды на структуру культуры чытання і тыпалогію чытачоў. Падыход Л. І. Бяляевай да тыпалогіі чытачоў. Канцэпцыі Л. Н. Засорынай і Б. Г. Умнова. Мадэлі чытацкай дзейнасці В. А. Барадзіной: агульная і структурна-функцыянальная.

Акмеалагічная канцэпцыя чытацкага развіцця. Чытацкае развіццё ва ўмовах экспансіі відэакультуры і пад уплывам камп’ютарных тэхналогій. Чытацкая сацыялізацыя як аб’ект акмеалогіі чытання. Метадалагічная аснова акмеалогіі чытання. Прынцыпы акмеалогіі чытання. Акмеалогія чытання і сучасныя праблемы падтрымкі чытання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 12. Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння чытача ў бібліятэках*

Мэта, задачы і прынцыпы сацыялогіі чытання і бібліятэчнай сацыялогіі. Праграма сацыялагічнага даследавання чытання як асноўны метадычны дакумент. Метадалагічны і працэдурны раздзелы праграмы. Вызначэнне праблемы і праблемнай сітуацыі як падставы для правядзення даследавання. Аб’ект, прадмет, мэта і задачы ў сацыялагічным даследаванні чытання. Інтэрпрэтацыя і аперацыяналізацыя ключавых паняццяў у сацыялагічным даследаванні чытання. Рабочыя гіпотэзы ў даследаванні чытання: віды і значэнне. Сістэмны аналіз аб’екта даследавання. Генеральная і выбарачная сукупнасці, прынцыпы выбаркі і іх ужыванне ў сацыялагічных даследаваннях чытання ў Беларусі. Выпадковая і квотная выбаркі: магчымасці выкарыстання ва ўмовах бібліятэкі. Рэпрэзентатыўнасць даследавання.

### *Тэма 13. Метады збору першаснай сацыялагічнай інфармацыі аб чытанні і чытацкіх паводзінах. Аналіз вынікаў даследавання*

Этапы станаўлення методыкі даследавання чытання. Агульныя і прыватныя метады даследавання. Распрацоўка працэдурнага раздзела праграмы. Сацыялагічныя, псіхалагічныя і педагагічныя метады ў даследаваннях чытання. Аналіз дакументаў, назіранне і апытанне як асноўныя метады збору першаснай сацыялагічнай інфармацыі. Межы і мэтазгоднасць ужывання кожнага з метадаў. Неабходнасць спалучэння некалькіх метадаў у даследаванні. Інструментарый даследавання і патрабаванні да яго.

Шкалы вымярэння сацыяльных паказчыкаў і межы іх ужывання ў даследаванні чытання. Намінальная, рангавая і інтэрвальная шкалы вымярэння. Іх магчымасці і асаблівасці ў вымярэнні сацыяльных паказчыкаў. Інструментарый, прызначаны для аналізу дакументаў. Карта назірання як асноўны інструмент сацыялагічнага даследавання. Анкета і бланк стандартызаванага інтэрв’ю. Структура анкеты і правілы яе складання. Зварот да карыстальніка. Фармуліроўка пытанняў і правілы іх размяшчэння ў анкеце. Віды пытанняў і іх магчымасці. Паспартычка. Комплекс інструментаў, неабходных і дастатковых для правядзення сацыялагічнага даследавання.

Каляндарны план правядзення даследавання. Пілатажнае і палявое даследаванне, іх функцыі. Колькасны аналіз вынікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследавання. Простае лінейнае размеркаванне вынікаў і яго магчымасці. Пабудова табліц суадносін колькасных паказчыкаў. Выкарыстанне сучасных праграмных сродкаў пры падрыхтоўцы і асэнсаванні вынікаў даследавання. Афармленне вынікаў даследавання і справаздача. Рэкамендацыі па выніках даследавання і іх укараненне ў практыку работы бібліятэк.

## Раздзел 4. Рэалізацыя псіхолага-педагагічных падыходаў у развіцці і падтрымцы чытання сродкамі бібліяграфічнай дзейнасці

### *Тэма 14. Педагагічныя кампаненты бібліяграфічнай дзейнасці: тэарэтычны аспект*

Фарміраванне псіхолага-педагагічнай канцэпцыі бібліяграфіі (60–80-я гг. XX ст.). Уклад Ю. М. Тугава, Н. Н. Салаўёвай, С. А. Трубнікава, Ю. С. Зубава, А. М. Фаміной у распрацоўку псіхалагічных, чытачазнаўчых, бібліятэчна-псіхолага-педагагічных пытанняў функцыянавання бібліяграфіі. Напрамкі развіцця псіхолага-педагагічнай канцэпцыі бібліяграфіі на сучасным этапе. Характарыстыка тэорыі бібліяграфічнай каштоўнаснай арыентацыі (З. А. Сафіуліна); тэорыі бібліяграфічных зносін, бібліяграфічнай камунікацыі (М. Р. Вохрышава); тэорыі бібліяграфічнай культуры (Н. Б. Зіноўева); кагнітаграфічнай бібліяграфічнай канцэпцыі (В. А. Факееў).

Унутраныя і знешнія, прыватныя функцыі бібліяграфічнай інфармацыі ў кантэксце характарыстыкі педагагічнага патэнцыялу бібліяграфічнай дзейнасці па забеспячэнні доступу да ведаў і інфармацыі. Якасці бібліяграфічнай інфармацыі (комплекснасць, камунікатыўнасць, універсальнасць, інклюзіўнасць), якія дэтэрмінуюць пазнавальны патэнцыял бібліяграфічнай дзейнасці. Магчымасці выкарыстання метадаў бібліяграфічнай дзейнасці (бібліяграфічнага згортвання, абвяшчэння аб дакументах, бібліяграфічнага пошуку, рэкамендацыі) у педагагічнай рабоце бібліятэк.

### *Тэма 15. Бібліяграфічныя зносіны ў сістэме бібліятэчных камунікацый*

Бібліяграфічныя зносіны як складаючая частка бібліятэчных камунікацый. Камунікатыўнасць як важная якасць бібліяграфіі, звязаная з трансляцыяй ведаў і інфармацыі. Характарыстыка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўных элементаў працэсу бібліяграфічных камунікацый. Асаблівасці аб'екта бібліяграфічных камунікацый. Роля бібліяграфічнай мовы, бібліяграфічнага тэксту і бібліяграфічнага метатэксту ў бібліяграфічнай камунікацыі. Спецыфіка рэалізацыі камунікатыўнасці ў працэсах бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання.

Бібліяграфічныя зносіны бібліятэкара і чытача як зносіны, зместам якіх з'яўляецца абмен бібліяграфічнай інфармацыяй. Функцыі бібліяграфічных зносін (інфарматыўная, рэгулятыўная, камунікатыўная) і іх рэалізацыя ў абслугоўванні карыстальнікаў. Спецыфічныя характарыстыкі бібліяграфічных зносін (творчы характар, мадэляванне патрэбнасцей карыстальнікаў, актыўны характар бібліятэкара і карыстальніка, узаемаразуменне). Сродкі бібліяграфічных зносін: кантактныя і дыстантныя; вусныя, пісьмовыя, кінетычныя, наглядныя, электронныя; знакавыя сістэмы. Магчымыя бар'еры ў бібліяграфічных зносінах і шляхі іх пераадолення.

### *Тэма 16. Педагагічныя аспекты бібліяграфічнага абслугоўвання і фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў*

Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў у бібліятэках як псіхолага-педагагічны працэс зносін бібліятэкара-бібліёграфа і карыстальніка. Асаблівасці бібліяграфічнага абслугоўвання ў сучасных умовах, якія ўзбагачаюць яго педагагічныя магчымасці: персаналізацыя бібліяграфічнага абслугоўвання, педагагічная падтрымка самаабслугоўвання (стварэнне ўмоў для самаабслугоўвання), пашырэнне зваротнай сувязі. Спалучэнне бібліяграфічнай і педагагічнай тэхналогій у бібліяграфічным абслугоўванні. Выкарыстанне прынцыпаў актыўнага навучання ў бібліяграфічным абслугоўванні: актыўнасць карыстальніка; актывізацыя творчай дзейнасці карыстальніка; праблемнасць навучання; спалучэнне навучання і выхавання і інш. Выкарыстанне актыўных метадаў навучання ў бібліяграфічным абслугоўванні: кантэкстнага навучання; педагогікі супрацоўніцтва; метадаў кагнітыўных тэхналогій.

Фарміраванне бібліяграфічнай культуры як кагнітыўны працэс. Мэтавая накіраванасць, змест, прынцыпы, метадычныя патрабаванні да арганізацыі работы. Напрамкі фарміравання бібліяграфічнай культуры ў бібліятэках: у ходзе навучальнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсу; фарміравання інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэках; правядзенне мэтанакіраваных мерапрыемстваў у працэсе нефармальнага навучання. Дыдактычныя ўмовы, формы і метады работы бібліятэк.

### *Тэма 17. Рэкамендацыйная бібліяграфічная дзейнасць у падтрымцы і развіцці чытання*

Рэкамендацыйная бібліяграфія: азначэнне і грамадскае прызначэнне. Метад рэкамендацыйнасці як крытэрый вызначэння рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Асаблівасці развіцця рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў розныя гістарычныя перыяды. Уклад С. А. Трубнікава, Ю. М. Тугава, Ю. С. Зубава, Н. Я. Дабрынінай, М. Р. Вохрышавай, А. М. Гарбунова, С. П. Бавіна ў тэарэтычнае асэнсаванне праблем рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Вызначэнне функцый рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў розныя гістарычныя перыяды. Сучасныя погляды на педагагічную, адукацыйную, выхаваўчую, асветніцкую функцыі рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Асноўныя падыходы да вызначэння зместу і задач рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Прынцыпы рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў падтрымцы і развіцці чытання. Напрамкі рэалізацыі функцыянальнага патэнцыялу рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў сацыяльнай практыцы, у т. л. педагагічнай дзейнасці бібліятэк.

### *Тэма 18. Сродкі і метады рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці ў рабоце бібліятэк*

Уяўленне аб сістэме рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў у розныя гістарычныя перыяды. Характарыстыка асноўных відаў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў, выдзяляемых па функцыянальна-мэтавым чытацкім прызначэнні, змесце, жанрава-тыпалагічных прыкметах.

Сучасны стан падрыхтоўкі і выдання крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў Рэспубліцы Беларусь. Асноўныя цэнтры, якія рыхтуюць крыніцы рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Дзейнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі як навуковага, метадычнага і выдавецкага цэнтра рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Роля рэспубліканскіх, універсальных навуковых абласных бібліятэк, бібліятэк УВА, публічных бібліятэк у вытворчасці крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Характарыстыка асноўных тыпаў і жанраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможні-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў: дапаможнікаў малых форм; новых жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў (нарысы, анталогіі, энцыклапедыі, даведнікі і інш.). Серыйныя выданні рэкамендацыйнай бібліяграфіі, іх тыпалагічныя асаблівасці. Рэкамендацыйная бібліяграфія ў сродках масавай і спецыяльнай перыёдыкі. Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі ў электронным асяроддзі як комплексны мультымедыйны інфармацыйны прадукт. Рэкамендацыйная бібліяграфія ў сетцы Інтэрнэт.

Сучасны стан рэкамендацыйнай бібліяграфіі для дзяцей у Рэспубліцы Беларусь. Рэкамендацыйная краязнаўчая бібліяграфія Рэспублікі Беларусь.

Бюлетэнь «Новыя кнігі: на старонках беларускага друку»: яго змястоўна-функцыянальны аналіз.

Напрамкі выкарыстання крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў рабоце бібліятэк. Выкарыстанне метадаў рэкамендацыйнага бібліяграфавання ў абслугоўванні карыстальнікаў, выставачнай дзейнасці, раскрыцці фондаў бібліятэкі. Рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк – метадычных цэнтраў у дапамогу павышэння кваліфікацыі, прафесійнаму развіццю супрацоўнікаў бібліятэк.

Патрабаванні да бібліёграфа – складальніка бібліяграфічных дапаможнікаў.

### *Тэма 19. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў*

Асаблівасці падрыхтоўкі крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў адпаведнасці з асноўнымі этапамі працэсу бібліяграфавання: выбар тэмы, вызначэнне мэтавага і чытацкага прызначэння, бібліяграфічная характарыстыка (анатаванне) дакументаў, групоўка матэрыялу, падрыхтоўка даведачна-метадычнага апарату.

Характарыстыка метадычных асаблівасцей падрыхтоўкі асобных тыпаў рэкамендацыйных бібліяграфічных крыніц – бібліяграфічных спісаў, паказальнікаў, аглядаў, мультымедыйных прэзентацый. Характарыстыка метадычных асаблівасцей падрыхтоўкі асобных жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў: нарысаў, кніжных закладак, даведнікаў, энцыклапедый, комплексных бібліяграфічных дапаможнікаў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізацыйныя, праграмна-тэхнічныя, метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі электронных бібліяграфічных дапаможнікаў рэкамендацыйнага характару.

## Раздзел 5. Сацыяльная работа бібліятэк як сфера ўвасаблення псіхолага-педагагічных тэхналогій

### *Тэма 20. Тэорыя і методыка сацыяльнай работы бібліятэк як кірунак бібліятэказнаўства*

Сучасныя працэсы дэмакратызацыі грамадскага жыцця абумовілі новае разуменне сацыяльнай работы бібліятэк. Працэс тэарэтычнага асэнсавання ролі бібліятэк у развіцці сацыяльнай работы. Станаўленне і развіццё новага навуковага кірунку ў бібліятэказнаўстве – бібліятэчнай сацыяноміі. Бібліятэчная сацыяноміка – тэорыя і методыка сацыяльнай работы бібліятэк як навуковае абгрунтаванне арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання асоб з абмежаванымі псіхафізічнымі магчымасцямі карыстання бібліятэкай. Праблемы стварэння сацыянамічнага бібліятэказнаўства (А. Я. Шапашнікаў). Асноўныя кірункі сацыянамічнага бібліятэказнаўства: агульнасацыянамічны, дэфекталагічны (карэкцыйна-педагагічны), геранталагічны, медыцынскі (бібліятэрапеўтычны) і пенітэнцыярны.

### *Тэма 21. Сацыяльная работа як спецыфічны від дзейнасці бібліятэк*

Сацыяльная работа як спецыфічны від дзейнасці публічных і спецыяльных бібліятэк. Аб’екты сацыяльнай работы бібліятэк – сацыяльна неабароненыя групы карыстальнікаў (інваліды, пажылыя і састарэлыя асобы, шпіталяваныя хворыя, зняволеныя, асобы «групы сацыяльнай рызыкі» і дэвіянтных паводзін і інш.).

Змест і сродкі сацыяльнай работы бібліятэк. Асноўныя кірункі работы бібліятэк у дапамогу сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі асоб з абмежаванымі магчымасцямі карыстання бібліятэкай.

Прафесійныя патрабаванні да бібліятэкара як сацыяльнага работніка: веданне фізіялагічных, псіхалагічных, сацыяльных праблем сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў; уменне валодаць методыкай вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў і запытаў; інфармаванасць у сферы міжнароднага, на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыянальнага заканадаўства; знаёмства з сістэмай карэкцыйных устаноў, рэабілітацыйных і сацыяльных службаў, дабрачынных і рэлігійных арганізацый, якія аказваюць дапамогу сацыяльна неабароненым групам насельніцтва. Змест паняцця «камунікатыўная культура бібліятэкара». Кампетэнтнасць у зносінах з рознымі чытацкімі групамі.

Праблема падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у сучаснай сацыякультурнай сітуацыі.

*Тэма 22. Гісторыя сацыяльнай работы бібліятэк Беларусі*

Роля царквы ў развіцці тэорыі і практыкі дабрачыннасці. Асэнсаванне паняцця «міласэрнасць» беларускімі філосафамі і асветнікамі (К. Тураўскі, Ф. Скарына, С. Полацкі і інш.). Роля праваслаўных брацтваў у Беларусі ў рэлігійна-маральнай асвеце і дабрачыннай дапамозе насельніцтву. Царкоўна-народныя бібліятэкі. Сацыяльна-педагагічная і асветніцкая дзейнасць беларускіх земстваў. Прыватная дабрачыннасць у Беларусі. Беларускія дабрачынныя грамадствы дапамогі «цяжкім» падлеткам. Прыцягненне падлеткаў да карыстання кнігамі. Станаўленне ў Беларусі сістэмы дзяржаўна-грамадскай дапамогі хворым і інвалідам. Адкрыццё першай бясплатнай народнай бібліятэкі ў Беларусі. Роля дабрачынных арганізацый («Апякунствы аб сляпых Марыінскага ведамства») у стварэнні бібліятэк для сляпых. Дабрачынная дзейнасць І. У. Здановіча. Арганізацыя сацыяльнай дапамогі глуханямым. Адкрыццё першай спецыяльнай школы для глуханямых дзяцей і стварэнне бібліятэкі ў дапамогу навучальнаму працэсу.

Кастрычніцкая рэвалюцыя і перагляд прынцыпаў дабрачыннасці і міласэрнасці. Ліквідацыя ўсіх дабрачынных устаноў. Станаўленне дзяржаўнай сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Грамадскія арганізацыі ў сістэме савецкай дзяржавы (Беларускае грамадства сляпых, Беларускае аб’яднанне глуханямых і інш.). Стварэнне сеткі школ-інтэрнатаў у Беларусі. Арганізацыя бібліятэк, якія абслугоўваюць інвалідаў і іншых асоб з дэвіянтнымі паводзінамі.

Бібліятэчнае абслугоўванне сацыяльна неабароненых груп насельніцтва ў 90-я гг. XX ст. Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма для сляпых у Беларусі. Яе роля ў арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку і іншых груп карыстальнікаў. Грамадскія сувязі бібліятэк для сляпых у вобласці сацы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яльнай работы. Стварэнне адзінай нарматыўна-прававой асновы дзейнасці бібліятэк.

Сучасны стан бібліятэчнага абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп насельніцтва. Ідэі інтэграванага бібліятэчнага абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў.

## Раздзел 6. Асноўныя суб'екты і кірункі сацыяльнай работы бібліятэк

### *Тэма 23. Бібліятэчнае абслугоўванне інвалідаў*

Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь. Спецыфіка бібліятэчнага абслугоўвання дадзенай чытацкай групы. Спецыяльныя бібліятэкі для інвалідаў, іх задачы і функцыі. Роля публічных бібліятэк у абслугоўванні розных груп інвалідаў. Рэалізацыя мэтавых праграм і праектаў. Стварэнне безбар'ернага бібліятэчнага асяроддзя. Месца бібліятэк у працэсе навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Узаемадзеянне спецыяльных бібліятэк з грамадскімі арганізацыямі.

Вывучэнне інфармацыйных запатрабаванняў інвалідаў як фактар фарміравання фондаў бібліятэк. Праблемы выдання літаратуры для сляпых (надрукаваных па сістэме Брайля, «агучаных» і інш. дакументаў). Камплектаванне бібліятэк аб'яднання глуханямых. Асаблівасці камплектавання бібліятэк спецыяльных школ.

Формы і змест бібліятэчна-інфармацыйных паслуг. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў бібліятэчным абслугоўванні інвалідаў. Іх роля ў пашырэнні інфармацыйнай прасторы. Выкарыстанне рэсурсаў Internet.

### *Тэма 24. Бібліятэчнае абслугоўванне пажылых і састарэлых людзей*

Пажылыя і састарэлыя людзі як спецыяльная катэгорыя карыстальнікаў бібліятэк. Фізіялагічная і псіхалагічная характарыстыкі людзей пажылога і састарэлага ўзросту. Тыпалогія чытачоў. Чытанне пажылых і састарэлых людзей як аб'ект навуковых даследаванняў.

Роля публічных бібліятэк у арганізацыі абслугоўвання пажылых і састарэлых асоб. Формы і змест бібліятэчна-інфарма-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйных паслуг. Арганізацыя пазастацыянарных форм абслугоўвання, дастаўка кніг дадому. Камфортнасць абслугоўвання. Актывізацыя работы з людзьмі пажылога ўзросту ў бібліятэках. Распрацоўка і рэалізацыя дзяржаўных, рэгіянальных і лакальных праграм і праектаў, накіраваных на абслугоўванне пажылых і састарэлых людзей.

*Тэма 25. Бібліятэчнае абслугоўванне хворых людзей у лячэбных установах. Бібліятэрапія*

Бібліятэкі пры лячэбных установах. Выяўленне асоб, якім неабходна бібліятэчнае абслугоўванне. Арганізацыя абслугоўвання. Выбар форм і метадаў работы. Арыентацыя работы дадзеных бібліятэк на інфармацыйныя запатрабаванні медыцынскага персаналу.

Трактоўка тэрміна «бібліятэрапія» рознымі вучонымі (У. М. Бяспалаў, Ю. М. Дрэшар, А. Л. Кабачак, Н. У. Клімянкова, М. П. Кутанін, А. М. Мілер, М. А. Рубакін, Б. А. Сіманаў, Р. А. Трафімава, А. Я. Шапашнікаў і інш.).

Бібліятэрапія як спецыфічны метад уздзеяння на чытанне. Выбар неабходнай літаратуры і тактыкі ажыццяўлення бібліятэрапеўтычнага ўздзеяння. Патрабаванні да спецыяліста-бібліятэрапеўта.

*Тэма 26. Бібліятэчнае абслугоўванне зняволеных*

З’яўленне турэмных бібліятэк у канцы XVIII ст. (ЗША). «Адзіночныя» турмы. Гуманныя адносіны да зняволеных у Расіі. Сведчанні аб стварэнні турэмных бібліятэк у афіцыйных інструкцыях і палажэннях першай паловы XIX ст. (С. М. Івашкін, У. Г. Шэйпак і інш.). Абмежаванне круга чытання зняволеных. Перавага кніг духоўна-маральнага зместу. З’яўленне літаратурных твораў і навуковых тэкстаў у фондах. Умовы ўтрымання зняволеных, якія дазваляюць ім выкарыстаць кнігі і бібліятэкі для самаадукацыі, стварэння навуковых прац, літаратурна-крытычных і мастацкіх твораў (М. Г. Чарнышэўскі, Д. І. Пісараў і інш.). З’яўленне ў турмах штатнай пасады бібліятэкара. Пагаршэнне ўмоў утрымання асуджаных пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Праца турэмных бібліятэк у савецкі час (А. А. Тарашчанка). Забеспячэнне літаратурай заняткаў і семінараў сацыяльна-прававых ведаў. Выкарыстанне бібліятэк зняволенымі ў самаадукацыйных і рэкрэацыйных мэтах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці дзейнасці турэмных бібліятэк у постсавецкі перыяд. Універсальны характар фондаў бібліятэк. Абмежаванне магчымасці камплектавання фонду.

Тэхналогія бібліятэчнага абслугоўвання зняволеных. Чытанне зняволеных як аб’ект навуковых даследаванняў (Л. З. Бахурын, А. У. Ячкоў, М. М. Самохіна і інш.). Формы і змест бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання. Фарміраванне культуры чытання зняволеных.

*Тэма 27. Этыка бібліятэчнага абслугоўвання чытачоў з дэвіянтнымі паводзінамі*

Паняцце «дэвіянтныя паводзіны чытачоў» (А. Я. Шапашнікаў). Формы дэвіянтных паводзін карыстальнікаў у бібліятэцы. Тыпы чытачоў з дэвіянтнымі паводзінамі. Этычныя патрабаванні да бібліятэкара ў працэсе зносін з чытачамі, якія маюць тыя або іншыя адхіленні ў паводзінах. Стварэнне атмасферы дружалюбнасці. Павага да чалавечай годнасці, зычлівасць і чуласць. Рэкамендацыя кніг, якія дапамагаюць вырашаць цяжкасці, умацаваць дух і жыццёвыя сілы. Формы і змест бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання.

## Раздзел 7. Замежны вопыт сацыяльнай работы бібліятэк

*Тэма 28. Абслугоўванне сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў бібліятэк за мяжой*

Бібліятэчнае абслугоўванне інвалідаў у ЗША і еўрапейскіх краінах. Вытокі бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў (XIX ст.). Публікацыя справаздач аб абслугоўванні сляпых кнігамі (Бібліятэка Кангрэса ЗША). Прыняцце закона аб абавязковым пачатковым навучанні сляпых дзяцей і аб усеагульным навучанні глуханямых. Пашырэнне чытацкай аўдыторыі інвалідаў. Бібліятэка Кангрэса ЗША на чале сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў. Яе роля ў камплектаванні бібліятэк выданнямі для сляпых. Бясплатная перасылка рэльефна-кропкавых і «агучаных» кніг. Стварэнне Нацыянальнай бібліятэчнай службы для сляпых і асоб з іншымі фізічнымі недахопамі (ЗША). Стварэнне «брайлеўскіх» бібліятэк у Англіі, Нямеччыне, Францыі (пач. XX ст.). Запіс «агучаных» кніг у розных краінах свету. Прызнанне сацыяльнай ролі бібліятэк для інвалідаў (70-я гг. XX ст.). Прынцыпы, метады і формы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы з людзьмі, якія маюць розныя фізічныя і псіхічныя недахопы. «Дзесяцігоддзе» інвалідаў (1983–1992). Міжнародныя праграмы і праекты. Тэхнічнае забеспячэнне абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў. Камп'ютарызацыя абслугоўвання.

Старэнне насельніцтва ў эканамічна развітых краінах свету. Абавязкі бібліятэк у дачыненні да пажылых чытачоў, рэалізацыя спецыяльных відаў абслугоўвання. Выкарыстанне новых інфармацыйных тэхналогій.

Гісторыя і сучасны стан бібліятэчнага абслугоўвання зняволеных у ЗША і краінах Заходняй Еўропы.

Сучасны стан бібліятэчнага абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў за мяжой.

*Тэма 29. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне бібліятэчнага абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў*

Роля ІФЛА ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва бібліятэк, якія абслугоўваюць сацыяльна неабароненыя групы карыстальнікаў. Праца спецыялізаваных секцый ІФЛА (секцыя публічных бібліятэк ІФЛА, секцыя бібліятэк для сляпых ІФЛА і секцыя ІФЛА па бібліятэчным абслугоўванні асоб з абмежаванымі магчымасцямі карыстання бібліятэкай і інш.). Падрыхтоўка і распаўсюджванне рэкамендацый у выглядзе метадычных матэрыялаў для бібліятэчных спецыялістаў па абслугоўванні сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў («Кіраўніцтва па бібліятэчным абслугоўванні зняволеных», «Рэкамендацыі ІФЛА па бібліятэчным абслугоўванні людзей з праблемамі зроку», «Кіраўніцтва ІФЛА па працы публічных бібліятэк» і інш.). Удзел бібліятэк Расіі і Рэспублікі Беларусь у дзейнасці спецыялізаваных секцый ІФЛА.

Арганізацыя і правядзенне міжнародных канферэнцый і семінараў па праблемах бібліятэчнага абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Тэмы заняткаў | Колькасць гадзін | | | | | Форма кантр. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | лекц. | практ. | сем. | лаб. | КСР | |
| ***Уводзіны*** | 1 | - | - | - | 4 | сем. |
| **Раздзел 1. Бібліятэчная педагогіка** | | | | | | |
| *Тэма 1.* Бібліятэчная педагогіка: гісторыя і сучаснасць | 2 | - | - | - | 8 | рэф. |
| *Тэма 2.* Сутнасць, значэнне, задачы, прынцыпы і катэгорыі бібліятэчнай педагогікі | 2 | - | - | - | 8 | сем. |
| *Тэма 3.* Педагагічныя ўмовы ўдасканалення бібліятэчна-інфармацыйный дзейнасці | 2 | 2 | 2 | - | 6 | сем. |
| **Раздзел 2. Бібліятэчныя зносіны як сродак рэалізацыі педагагічных функцый бібліятэкі** | | | | | | |
| *Тэма 4.* Сутнасць, спецыфіка і педагагічная накіраванасць прафесійных зносін бібліятэкара | 2 | 2 | 2 | - | 6 | сем. |
| *Тэма 5.* Умовы і прыёмы эфектыўнага міжасабовага ўзаемадзеяння бібліятэкара з карыстальнікам у працэсе абслугоўвання | 2 | 2 | - | - | 8 | апыт. |
| *Тэма 6.* Прафілактыка і ліквідацыя канфліктных сітуацый у бібліятэчных зносінах | 2 | 2 | - | 2 | 6 | рэф. |
| *Тэма 7.* Арганізацыя чытацкіх зносін у сучаснай бібліятэцы | 2 | 2 | - | 2 | 6 | сем. |
| *Тэма 8.* Чытацкая і камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара як перадумова яго прафесійнай самарэалізацыі | 1 | - | - | 2 | 8 | рэф. |
| **Раздзел 3. Чытанне як псіхалагічны працэс і прадмет даследавання** | | | | | | |
| *Тэма 9.* Развіццё псіхалогіі і сацыялогіі чытання ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць | 2 | | 2 | - | 6 | сем. |
| *Тэма 10.* Псіхалагічная структура чытацкай дзейнасці, чы- | 2 | 2 | - | 2 | 4 | апыт. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| тацкай свядомасці і чытацкіх зносін. Чытацкая накіраванасць і чытацкі статус асобы | | | | | | |
| *Тэма 11.* Праблемы тыпалогіі чытача з пункту гледжання тэорыі чытацкага развіцця. Акмеалагічная канцэпцыя чытання | 2 | 2 | - | - | 4 | рэф. |
| *Тэма 12.* Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння чытача ў бібліятэках | 4 | 2 | - | - | 8 | абарона інд. заданняў |
| *Тэма 13.* Метады збору першаснай сацыялагічнай інфармацыі аб чытанні і чытацкіх паводзінах. Аналіз вынікаў даследавання | 4 | 2 | 2 | 2 | 6 | абарона інд. заданняў |
| **Раздзел 4. Рэалізацыя псіхолага-педагагічных падыходаў у развіцці і падтрымцы чытання сродкамі бібліяграфічнай дзейнасці** | | | | | | |
| *Тэма 14.* Педагагічныя кампаненты бібліяграфічнай дзейнасці: тэарэтычны аспект | 2 | 2 | - | - | 2 | сем. |
| *Тэма 15.* Бібліяграфічныя зносіны ў сістэме бібліятэчных камунікацый | 2 | | 2 | | 2 | сем. |
| *Тэма 16.* Педагагічныя аспекты бібліяграфічнага абслугоўвання і фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў | 1 | 2 | 2 | | 2 | сем. |
| *Тэма 17.* Рэкамендацыйная бібліяграфічная дзейнасць у падтрымцы і развіцці чытання | 1 | 2 | - | | 2 | рэф. |
| *Тэма 18.* Сродкі і метады рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці ў рабоце бібліятэк | 2 | - | - | - | 4 | абарона інд. заданняў |
| *Тэма 19.* Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў | 2 | 2 | - | - | 2 | абарона інд. заданняў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел 5. Сацыяльная работа бібліятэк як сфера ўвасаблення псіхолага-педагагічных тэхналогій** | | | | | | |
| *Тэма 20.* Тэорыя і методыка сацыяльнай работы бібліятэк як кірунак бібліятэказнаўства | 2 | 2 | | - | 2 | сем. |
| *Тэма 21.* Сацыяльная работа як спецыфічны від дзейнасці бібліятэк | 1 | | 2 | - | 2 | сем. |
| *Тэма 22.* Гісторыя сацыяльнай работы бібліятэк Беларусі | 2 | - | - | - | 2 | сем. |
| **Раздзел 6. Асноўныя суб'екты і кірункі сацыяльнай работы бібліятэк** | | | | | | |
| *Тэма 23.* Бібліятэчнае абслугоўванне інвалідаў | 2 | 2 | - | - | 2 | рэф. |
| *Тэма 24.* Бібліятэчнае абслугоўванне пажылых і састарэлых людзей | 1 | 2 | - | - | 2 | абарона інд. заданняў |
| *Тэма 25.* Бібліятэчнае абслугоўванне хворых людзей у лячэбных установах. Бібліятэрапія | 1 | 2 | - | - | 2 | рэф. |
| *Тэма 26.* Бібліятэчнае абслугоўванне зняволеных | 1 | 2 | - | - | 2 | сем. |
| *Тэма 27.* Этыка бібліятэчнага абслугоўвання чытачоў з дэвіянтнымі паводзінамі | 2 | - | - | - | 2 | рэф. |
| **Раздзел 7. Замежны вопыт сацыяльнай работы бібліятэк** | | | | | | |
| *Тэма 28.* Абслугоўванне сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў бібліятэк за мяжой | 2 | 2 | - | - | 2 | сем. |
| *Тэма 29.* Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне бібліятэчнага абслугоўвання сацыяльна неабароненых груп карыстальнікаў | 2 | | - | - | 2 | рэф. |
| **Разам ...** | **56** | **38** | **14** | **10** | **122** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*


*1.* Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь ад 22 сак. 1995 г. № 3680-XII : в ред. Закона Респ. Беларусь от 1 июля 2014 г. № 173-З // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=v19503680&p2={NRPA}. – Дата доступа : 03.04.2015.

*2.* Государственная программа по созданию безбарьерной среды жизнедеятельности физически ослабленных лиц на 2011–2015 годы: в ред. постановления Совмина от 09.07.2011 № 936 // КонсультантПлюс. Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2013.

*3. Бавин, С. П.* Очерки новейшей истории рекомендательной библиографии ГБЛ (1985–2005) : моногр. / С. П. Бавин. – М. : Пашков дом, 2006. – 279 с.

*4. Бородина, В. А.* Теория и технология читательского развития в отечественном библиотековедении: научные и методические основы / В. А. Бородина. – М. : Шк. б-ка, 2006. – 335 с.

*5. Васильев, И. Г.* Социологические исследования в библиотеках: практ. пособие [Текст] / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский. – СПб. : Профессия, 2003. – 176 с. – (Серия «Библиотечный практикум»).

*6. Диянская, Г. П.* Принцип равных возможностей в тифлобиблиотековедении и библиотечном обслуживании инвалидов по зрению / Г. П. Диянская ; Рос. гос. б-ка для слепых. – М., 1998. – 344 с.

*7. Езова, С. А.* Библиотечное общение как феномен исследования : моногр. [Текст] / С. А. Езова. – М. : Либерея–Бибинформ, 2007. – С. 3–13.

*8. Зыгмантович, С. В.* Подготовка библиографической продукции библиотеками: науч.-практ. пособие / С. В. Зыгмантович. – Минск : Новое знание, 2009. – 229 с. – (Профессионалам библиотечного дела).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Ивашкин, С. Н.* Библиотеки пенитенциарных учреждений : моногр. / С. Н. Ивашкин. – М. : Либерия–Бибинформ, 2008. – 94 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век»; вып. 98).

*10.* Интернет-ресурсы. Общие требования доступности для инвалидов по зрению = Інтэрнэт-рэсурсы. Агульныя патрабаванні даступнасці для інвалідаў па зроку : СТБ 2304–2013. – Введ. 01.09.2013. – Минск : Госстандарт : Белорус. гос. ин-т стандартизации и сертификации, 2013. – 6 с.

*11. Клімянкова, Н. У.* Канцэпцыі бібліятэчнай педагогікі, задачы, прынцыпы, катэгорыі: сутнасць і перспектывы развіцця / Н. У. Клімянкова // Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне: манагр. / навук. рэд. С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянкова. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 18–28.

*12. Клімянкова, Н. У.* Педагагічныя ўмовы забеспячэння карыстальнікам бібліятэк адкрытага доступу да інфармацыі і культурных каштоўнасцей / Н. У. Клімянкова // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2013. – № 2(20). – С. 99–106.

*13. Клімянкова, Н. У.* Сацыялогія і псіхалогія чытання : вучэб.-метад. дапам. / Н. У. Клімянкова – Мінск : БДУКМ, 2015. – 212 с.

*14. Петушко, Н. Е.* Библиотечное обслуживание инвалидов по зрению : теоретико-методический аспект : науч.-практ. пособие / Н. Е. Петушко. – М. : Литера, 2012. – 328 с.

*15. Петушко, Н. Е.* Социономическое библиотековедение: к определению содержания / Н. Е. Петушко // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2012. – № 1(17). – С. 104–113.

*16.* Рекомендательная библиография и библиотечная практика : сб. докл. и сообщ. / Рос. гос. б-ка ; сост. С. П. Бавин. – М. : Пашков дом, 2007. – 167 с. – (Вопросы библиографоведения ; вып. 15).

*17. Рубакин, Н. А.* Психология читателя и книги : краткое введение в библиологическую психологию [Текст] / Н. А. Рубакин. – М. : Книга, 1977. – 264 с.

*18.* Современные информационные технологии в библиотечно-информационном обслуживании пользователей с нарушениями зрения : метод. рекомендации для библиотек / Нац. б-ка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуси ; сост. : О. А. Нестеревская, И. И. Василенок ; под науч. ред. Е. Е. Долгополовой. – Минск, 2015. – 50, [1] с.

*19*. Среда обитания физически ослабленных лиц. Основные положения = Асяроддзе пражывання для фізічна аслабленых асоб. Асноўныя палажэнні : СТБ 2030–2010. – Введ.01.08.10. – Минск : Белорус. гос. ин-т стандартизации и сертификации, 2010. – 26 с.

*Дадатковая*

*1. Бабичева, М. Е.* Рекомендательная библиография в РГБ в III тысячелетии: сохранение традиций и поиск новых форм / М. Е. Бабичева // Труды Междунар. библиографического конгресса, Санкт-Петербург, 21–23 сент. 2010 г. / Рос. нац. б-ка ; науч. ред. Н. К. Леликова. – СПб. : РНБ, 2012. – С. 454–461.

*2. Бавин, С. П.* Рекомендательная библиография: состояние и перспективы / С. П. Бавин // Труды Междунар. библиографического конгресса, Санкт-Петербург, 21–23 сент. 2010 г. / Рос. нац. б-ка ; науч. ред. Н. К. Леликова. – СПб. : РНБ, 2012. – С. 447–454.

*3. Беспалов, В. М.* Психология чтения : учеб. пособие для вузов культуры и искусств / В. М. Беспалов. – М. : МГУКИ, 2007. – 198 с.

*4.* Библиопсихология и библиотерапия / ред. Н. С. Лейтес, Н. Л. Карпова, О. Л. Кабачек. – М. : Шк. б-ка, 2005. – 480 с.

*5.* Библиотекарь и читатель: Проблемы общения: выбор оптимальных способов общения с читателями в условиях муниципальной библиотеки. Вып. 2. – СПб., 2000. – 99 с.

*6. Богданова, И. А.* Библиотечный диалог: аспекты речевого общения : учеб.-метод. пособие / И. А. Богданова. – М. : ЛИБЕРЕЯ-БИБИНФОРМ, 2006. – 118 с.

*7. Васильев, В. И.* Культура чтения как составляющая книжной культуры: особенности изучения, подходы, перспективы развития / В. И. Васильев, М. А. Ермолаева, Д. Н. Бакун // Материалы III Междунар. конгресса «Библиотека как феномен культуры»: чтение и информационная культура в современном обществе, Минск, 21–22 окт. 2015 г. / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2015. – С. 22–28.

*8. Ганзикова, Г. С.* Рекомендательно-библиографическая деятельность детских библиотек в Интернете (направления

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

и педагогические принципы) / Г. С. Ганзикова // Библиотековедение. – 2008. – № 3. – С. 46–50.

9. *Диянская, Г. П.* Библиотеки для слепых за рубежом / Г. П. Диянская // Аспекты обеспечения равного доступа к информации / Рос. гос. б-ка для слепых. – М., 1996. – 193 с.

10. *Долгополова, Е. Е.* Библиотеки и поддержка чтения: к постановке проблемы / Е. Е. Долгополова // Материалы III Междунар. конгресса «Библиотека как феномен культуры» : чтение и информационная культура в современном обществе, Минск, 21–22 окт. 2015 г. / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2015. – С. 10–20.

11. *Долгополова, Е. Е.* Развитие библиотечного обслуживания в контексте информационного поведения пользователей / Е. Е. Долгополова // Бібліятэчны веснік : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 3. – С. 188–198.

12. *Долгополова, Е. Е.* Типовые характеристики информационного поведения современного пользователя библиотеки: по результатам республиканского исследования / Е. Е. Долгополова // Науч. и техн. б-ки. – 2014. – № 2. – С. 27–34. – (Крым-2013).

13. *Зубков, Н. Н.* Книга и некнижная коммуникация в библиотеке / Н. Н. Зубков // Материалы III Междунар. конгресса «Библиотека как феномен культуры»: чтение и информационная культура в современном обществе, Минск, 21–22 окт. 2015 г. / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2015. – С. 20–22.

14. *Зыгмантовіч, С. В.* Педагагічныя аспекты бібліяграфічнай дзейнасці / С. В. Зыгмантовіч // Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 52–68.

15. *Зыгмантовіч, С. В.* Рэкамендацыйна-бібліяграфічная дзейнасць Рэспублікі Беларусь / С. В. Зыгмантовіч // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2010. – № 8. – С. 54–60.

16. *Казленка, А. Ю.* Сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі / А. Ю. Казленка // Сацыяльна-педагагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк Беларусі і іх кадравае забеспячэнне. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 68–77.

17. *Клименкова, Н.В.* Библиотерапия как направление библиотечной педагогики / Н. В. Клименкова // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці: матэрыялы навук.-практ. канф., 21–22 кастр. 2009 г. – Мінск, 2010. – С. 32–38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18. Клімянкова, Н.У.* Бібліятэчная педагогіка ў грамадстве ведаў: тэарэтыка-метадычны аспект / Н. У. Клімянкова // Искусство и культура : науч.-практ. журнал. – 2012 – № 2(6). – С. 101–106.

*19. Клименкова, Н. В.* Организация читательского общения как фактор повышения привлекательности современной библиотеки / Н. В. Клименкова // Материалы Междунар. конгресса «Библиотека как феномен культуры», Минск, 23–24 окт. 2013 г. / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2013. – С. 200–206.

*20. Петушко, Н. Е.* Частная методика библиотечного обслуживания: пути разработки специализированных учений / Н. Е. Петушко // Культура: открытый формат (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; сост. : Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева ; ред. сов. : В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2014. – С. 386–392.

*21. Шапошников, А. Е.* Библиотечная социономика как развивающаяся область знания / А. Е. Шапошников // Библиотековедение. – 2001. – № 6.– С. 61–64.

*22. Шапошников, А. Е.* Библиотечное обслуживание инвалидов: история, современность, тенденции / А. Е. Шапошников. – М., 1992. – 210 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя метады выкладання

Сярод эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць удзелу студэнтаў у пошуку і кіраванні ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці, камунікатыўныя тэхналогіі, метад аналізу вытворчых сітуацый, гульнявыя тэхналогіі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў вучэбнай дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і экзаменаў.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па раздзелах: «Бібліятэчныя зносіны як сродак рэалізацыі педагагічных функцый бібліятэкі», «Чытанне як псіхалагічны працэс і прадмет даследавання», «Рэалізацыя псіхолага-педагагічных падыходаў у развіцці і падтрымцы чытання сродкамі бібліяграфічнай дзейнасці», «Сацыяльная работа бібліятэк як сфера ўвасаблення псіхолага-педагагічных тэхналогій» па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму. Пры напісанні работы можна выкарыстоўваць літаратуру па вучэбнай дысцыпліне.

## Формы выканання самастойнай работы:

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка праграмы і методыкі даследавання чытання;

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– распрацоўка аўдыявізуальнай прэзентацыі (не карацей за 2 хвіліны дэманстрацыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ***Прыкладныя тэмы для самастойнай работы***

*Раздзелы 1–3 (Бібліятэчная педагогіка, Бібліятэчныя зносіны, Чытанне як псіхалагічны працэс і прадмет даследавання)*

1. Педагогіка супрацоўніцтва ва ўмовах бібліятэкі
2. Сацыяльна-педагагічныя аспекты бібліятэчных зносін
3. Трансактны аналіз і яго выкарыстанне ў бібліятэчных зносінах
4. Тыпы канфліктагенаў і спосабы рэагавання на іх з мэтай прадухілення канфлікту
5. Чытацкія зносіны ў электронным асяроддзі: спецыфіка і спосабы выкарыстання ў бібліятэцы
6. Шляхі і спосабы фарміравання і ўдасканалення камунікатыўнай культуры бібліятэкара
7. Вынікі сацыялагічных даследаванняў чытання на старонках прафесійнага друку і ў дысертацыйных даследаваннях
8. Чытацкае развіццё ва ўмовах экспансіі відэакультуры і пад уплывам камп'ютарных тэхналогій

*Раздзел 4. Рэалізацыя псіхолага-педагагічных падыходаў у развіцці і падтрымцы чытання сродкамі бібліяграфічнай дзейнасці*

9. Метадалагічныя падыходы да раскрыцця бібліяграфічнай дзейнасці як педагагічнага працэсу
10. Бібліяграфічныя зносіны бібліятэкара і карыстальніка ў сацыяльных сетках
11. Выкарыстанне актыўных метадаў навучання ў бібліяграфічным абслугоўваннні
12. Асноўныя падыходы да вызначэння зместу і задач рэкамендацыйнай бібліяграфіі
13. Сучасны стан рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў Рэспубліцы Беларусь
14. Асаблівасці падрыхтоўкі рэкамендацыйнай вэб-бібліяграфіі

*Раздзелы 5–7 (Сацыяльная работа бібліятэк)*

15. Асноўныя кірункі сацыянамічнага бібліятэказнаўства
16. Прафесійныя патрабаванні да бібліятэкара як сацыяльнага работніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Асэнсаванне паняцця «міласэрнасць» беларускімі філасафамі і асветнікамі

18. Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў бібліятэчным абслугоўванні інвалідаў

19. Роля публічных бібліятэк у арганізацыі абслугоўвання пажылых і састарэлых асоб

20. Чытанне зняволеных як аб'ект навуковых даследаванняў

21. Формы дэвіянтных паводзін карыстальнікаў у бібліятэцы і спосабы іх нейтралізацыі

22. Роля ІФЛА ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва бібліятэк, якія абслугоўваюць сацыяльна неабароненыя групы карыстальнікаў

**Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі**

Аб'ектам дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў з'яўляюцца акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя віды кампетэнцый, зафіксаваныя ў адукацыйным стандарце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках).

Для выніковай дыягностыкі кампетэнцый студэнта па дысцыпліне «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» праводзіцца залік і экзамен. Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта на заліку і экзамене ажыццяўляецца з улікам актыўнасці работы на лекцыйных, семінарскіх, практычных і лабараторных занятках, а таксама з улікам дасягненняў і выканання ім кантралюемай і кіруемай самастойнай работы.

Для ацэнкі дасягненняў студэнтаў па дысцыпліне «Псіхолага-педагагічныя асновы бібліятэчнай дзейнасці» і дыягностыкі фарміравання кампетэнцый студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– удзел студэнта і выступленне яго на семінары з падрыхтаваным інфармацыйным (тэматычным) паведамленнем і інш.;

– абарона заданняў, выкананых на практычных і лабараторных занятках;

– падрыхтоўка рэфератаў па асобных тэмах, раздзелах дысцыпліны;

– абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– падрыхтоўка тэстаў па асобных тэмах, раздзелах дысцыпліны;

– падрыхтоўка прэзентацый;

– вусныя бягучыя кантрольныя апытанні па асобных тэмах падчас заняткаў;

– залік і экзамен па дысцыпліне;

– іншыя сродкі дыягностыкі, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСНОВЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,09. Ул.-выд. арк. 1,53. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ